
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года **№ 18 (704)** **18 ТРАЎНЯ 2005 г.**

NESTLE FOOD LLC
Valovaya str. 1, bld.1 (Paveletskaya sq. 2, bld.1)
Moscow, Russia, 115054
Tel: (7095) 725-7000
Fax: (7095) 725-7070



April 25, 2005

Mr. Aleh Trusau
The Chairman of
the Belarusian Language Society

Дзякуй Вам за пісьмо ад 29 сакавіка 2005 года, у якім ішла размова аб выкарыстанні беларускай мовы ў некалькіх нашых рэкламных роліках.

Паколькі "Нестле" вядзе сваю дзейнасць у глабальных маштабах, кампанія ўлічвае патрэбнасць і жаданні мясцовых спажыўцоў, а таксама культурныя і моўныя адрозненні. Мы расцэньваем беларускі рынак як вельмі важны для нас, і мы з вялікай павагай адносімся да мясцовых традыцый і мовы і робім усё магчымае, каб нашы прадукты і маркетынгавая палітыка адпавядалі спадзяванням беларускіх спажыўцоў.

Дзякуй Вам яшчэ раз.

General Director of Nestle Food LLC – Bernard Meunier.

Першыя крокі ў навуку

Пад такім дэвізам прайшла VI Смаргонская навукова-практычная краязнаўчая канферэнцыя, якая адбылася 22-га красавіка ў чацвёртай гарадской гімназіі. Яе ўдзельнікі - гімназісты старэйшых класаў. Працавалі тры секцыі: беларускай мовы і літаратуры, прыродазнаўчых навук, гісторыі.

Мне выпала выслухаць вучнёўскія паведамленні на секцыі беларускай мовы і літаратуры. Іх было шэсць. Прынамсі:

1. Літаратурная спадчына Смаргоншчыны.
2. Моўны этыкет.
3. Максім Багдановіч: паэт-музыка, паэт-жывапісец.
4. Тапаніміка і антрапаніміка: найбольш цікавыя раздзелы анамастыкі. Даследаванне асаблівасцяў мясцовых назваў і імён.
5. Набліжэнне да Францішка Багушэвіча.
6. Вобраз бацькаўшчыны ў аповесці Артура Цяжкага "Смутак".

Адпаведна іх аўтарамі былі: Васільева Карына, 10 "В" клас (кіраўнік У. У. Прыхач), Высоцкі Дзмітры, 8 "А" клас (кіраўнік Г. Я. Рудая), Кавяза Алена, 8 "А" клас (кіраўнік Г. Я. Рудая), Гусь Святлана, УА "СШ № 1 г. Ашмяны", Айрапецян Навэла, 8 "А" клас (кіраўнік Г. Я. Рудая), Ермаловіч Кацярына, 8 "Г" клас (кіраўнік Т. А. Буйноўская).

Усе гэтыя паведамленні выслухаў я, скажу шчыра, з трапяткім хваляваннем, калі не сказаць, з замілаваннем. Здавалася, калі б была мая воля, я ўсіх юных рэфэрэнтаў залічыў бы на філалагічны факультэт: гэткія іхнія паведамленні былі глыбокія, пранікнёныя. Асабліва мяне ўразіла паведамленне васьмікласніцы Навэлы Айрапецян "Набліжэнне да Францішка Багушэвіча". Тэма гэтага паведамлення глыбінная: набліжэнне да Францішка Багушэвіча - гэта значыць набліжэнне да ўсяго нацыянальнага, да ўсяго беларускага. Уразіла і тое, што за гэтую тэму ўзялася дзяўчынка з армянскім прозвішчам і імем. Пад час перапынку я не стрымаўся, падышоў да Навэлы Айрапецян, пацікавіўся, хто яна, чаму абрала такую тэму. На мае пытанні Навэла адказала: "Тэму "Набліжэнне да Багушэвіча" я абрала таму, што лічу асобу гэтага пісьменніка вельмі важнай у гісторыі і развіцці беларускай мовы і літаратуры".

Пра сябе ж Навэла паведаміла: "Мяне так назвалі таму, што такое імя мела мая бабуля - татава маці. А мой тата армянін. Але я ўжо нарадзілася ў Смаргоні. Мама мая - беларуска..."

Здаецца, усё проста і зразумела. І ўсё ж, чаму ж мяне гэтак усхвалявала Навэліна паведамленне?

Пэўна таму, што яна, чалавек новай генерацыі, адчула ў Багушэвічавай постаці гарманічную цэласнасць паэтавага светапогляду на свой народ, яго мову, гісторыю, сугучнага ёй.

Перакананы, змест Навэлінага паведамлення станецца з цягам часу яе глыбокім перакананнем, а гэта ўжо зарука, што парыванні Багушэвічавай душы былі не марныя. Яны трапляюць у спрыяльную глебу XXI стагоддзя і даюць добры плён.

Цікавыя былі вучнёўскія паведамленні і на гістарычнай секцыі. Усе яны з пазнання гісторыі роднага краю, роднай Смаргоншчыны. Сярод іх:

1. Культавыя помнікі Смаргоншчыны. Шышкевіч Ганна, 10 "Б" клас (кіраўнік Абушка І. А.).
2. Спаса-Прэабражэнская царква ў Смаргоні. Новаш Павел, 10 "В" клас (кіраўнік Абушка І. А.).
3. Папяровы млын у Смаргоні. Чырыца Алена, 10 "В" клас (кіраўнік Абушка І. А.).
4. Ігнат Дамейка: вучоны, этнограф, фалькларыст. Казачонак Кацярына, 10 "Б" клас (кіраўнік Абушка І. А.).

Вайсковыя баталіі на Смаргоншчыне ў XX стагоддзі таксама не былі абыдзены юнымі краязнаўцамі, іх першыя крокі ў навуку абнадзейваюць. Балазе, усе працы юных даследчыкаў, як паведамілі кіраўнікі шостай Смаргонскай навукова-практычнай канферэнцыі, будуць надрукаваны ў агульным зборніку.

Уладзімір Содаль.

Юбілей Людмілы Майсені


У пачатку траўня адзначыла круглую дату ў сваім жыцці адна з найвыдатнейшых патрыётак Беларусі, дачка старажытнай Нясвіжчыны, палымяны змагар за беларускую мову **Людміла Майсеня.**



Народжаная ў сям'і беларускіх вясковых інтэлігентаў, ёй не давялося ў пачатку 90-х вяртацца да беларускасці, як многім у той час. Яна была беларускаю і ў 70-я, і ў 80-я. Закончыўшы фізіка-матэматычны факультэт Менскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, абараніўшы кандыдацкую дысертацыю, Людміла Майсеня выкладала вышэйшую матэматыку ў Менскім радыётэхнічным інстытуце і Менскім радыётэхнічным каледжы, дзе працуе і зараз.

Ёй не трэба было чакаць на покліч роднага краю, яна здольная была пачуць і самы ціхенькі шэпт. Як толькі першыя нацыянальныя сокі пабеглі па карэньчыках амаль засохлага дрэва Беларушчыны, Людміла Майсеня стала ў шэрагі нацыянальнай інтэлігенцыі, стала на шлях адраджэння. Яна ўвайшла ў шэраг грамадскіх арганізацый, была сябрам сойму БНФ "Адраджэньне", на сёння з'яўляецца сябрам Рады ГА "ТБМ імя Францішка Скарыны". Але не ў выступы на сходах і мітынгах укладала сваю энергію і сваё натхненне гэтая ў многім імпульсіўная і бескампрамісная жанчына. На стаптаным полі Беларушчыны ўбачыла яна сваю дзялянку і пачала вырабляць яе мэтанакіравана і ўпарта, штодзённа і на працягу многіх гадоў.

Вярнуць беларускую мову ў вышэйшую матэматыку ці вярнуць вышэйшую матэматыку ў беларускамоўную навуку. Гэта стала сэнсам жыцця і аб'ектам прыкладвання творчых сілаў кандыдата фізіка-матэматычных навук Людмілы Майсені. Пра стан матэматычнай навукі ў Беларусі дакладна сказана ў артыкуле Людмілы Майсені і Васіля Юферава "Знішчэнне беларускай адметнасці ў матэматычнай тэрміналогіі": "Амаль 60 гадоў у Беларусі не выдалі па-беларуску ніводнага падручніка па матэматыцы ні для ВНУ, ні для сярэдніх спецыяльных устаноў... **Беларуская мова як мова матэматычнай навукі перастала існаваць.** Матэматычныя артыкулы па-беларуску не друкаваліся на працягу шасці дзесяцігоддзяў - да ўзнаўлення нашай незалежнасці..." ("Аняменне ...", 2000 г.) Супраць гэтай катастрафічнай сітуацыі і выступіла са сваімі калегамі і аднадумцамі Людміла Майсеня.



Яна адной з першых перайшла на выкладанне вышэйшай матэматыкі па-беларуску і ўвайшла ў аўтарскія калектывы па напісанні трохтомнага "Курса вышэйшай матэматыкі" (апошні том выйшаў у 2003 годзе) на беларускай мове, а таксама "Матэматычнай энцыклапедыі" (2001 г.). Пры гэтым так атрымалася, што каб давесці выданне трохтомніка да канца Людміле Майсені давялося 3-ці том напісаць адной. У том увайшлі такія раздзелы як "Тэорыя функцый комплекснай зменнай" і "Аперацыйнае злічэнне". Зразумела, што выданню гэтых кніг папярэднічала зацятая барацьба на полі тэрміналогіі, і тое, што матэматычная тэрміналогія ў гэтых кнігах набыла беларускае гучанне, з'яўляецца вынікам цвёрдых пазіцый Людмілы Майсені па гэтым пытанні.

Людміла Майсеня была старшынёй рэдкалегіі і згаданай ужо кнігі "Аняменне. З хронікі знішчэння беларускай мовы" (2000 г.), найбольш грунтоўнага выдання, здзейсненага ТБМ. Яна не толькі сабрала ўвесь матэрыял для кнігі і, фактычна, сфармавала структуру рукапісу, але і прыдумала назву "Аняменне".

На сёння, у свой юбілейны год, Людміла Майсеня прадаўжае самаадданa працаваць для Беларусі, і ТБМ можа ганарыцца, што ў яго шэрагах знаходзіцца такая адданая беларускай справе жанчына.

Сакратарыят ТБМ, рэдакцыя газеты "Наша слова" шчыра вінуюць спадарыню Людмілу Майсеню з юбілеем і зычаць ёй плёну на ніве самаадданай і рупнай працы на карысць Беларусі.

Фальклярыст, літаратар, прафесар Цішчанка

Да 75 угодкаў народзінаў

Іван Кірылавіч Цішчанка быў арганічны фальклярыст. Традыцыйную культуру народа спасцігаў ля самых яе вытокаў. Пасцігаў з юнацтва, яшчэ несвядома ўдзельнічаючы ў яе дзеях-праявах.

Дзед Аніська слыў на ўсю ваколіцу пчаляром. Быў носьбітам народнай мудрасці. Унікальную замову на пчаліны рой, запісаную ад яго, Іван ужо навукоўцам змясціў у хрэстаматыю "Беларускі фальклор". Старэйшая сястра Вольга слыла на ўсю вёску Прылукі, што на магілёўскай Слаўгарадчыне, галасістай пявунняй. Будучы фальклярыст змалку жыў у стыхіі народнай культуры: юнаком граў на вясковых вячорках, браў удзел у спеўках моладзі. Тым часам жыццё рана прад'явіла будучаму вучонаму, літаратару свае жорсткія прэтэнзіі. У 1937 годзе меў сем год, калі быў рэпрэсаваны бацька Кірыла Анісімавіч, старшыня калгаса. Не вярнуўся з вялікай вайны старэйшы брат Аляксей. Дырэктар слаўгарадскай школы перад смерцю прызнаўся свайму былому выпускніку, што не мог выдаць яму атэстат з залатым медалём, бо афіцыйна лічыўся на той час Іван сынам "ворага народа". Былі праблемы і ў ва універсітэце, калі ўдалося паступіць на філалагічны факультэт. А выбіраў яго таму, што ўжо спрабаваў пяро ў слаўгарадскай раёнцы. Любоў да літаратуры спакушала на вершаваную форму выказвання.



Заснаваны ў 1957 годзе Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР ды крыху пазней навукова-выдавецкая ўстанова "Беларуская энцыклапедыя" – плён стратэгічнай думкі тагачаснай ніклай беларускай эліты. Прадыктаваныя клопатам пра будучыню айчыннай навукі і культуры, гэтыя структуры адкрывалі добрую перспектыву для развіцця мастацтва і народазнаўства, беларускай гуманітарыстыкі ў цэлым. Іван Кірылавіч як і некаторыя іншыя выпускнікі ВНУ рэспублікі, трапіўшы ў ІМЭФ АН, якім кіраваў акадэмік Пятро Глебка, атрымаў рэальны шанец рэалізаваць сябе на навуковай ніве.

Працуючы малодшым навуковым супрацоўнікам, актыўна спрычыніўся да падрыхтоўкі і выдання манументальнага акадэмічнага зводу беларускага фальклору. Падрыхтаваў пяць тамоў з серыі БНТ "Жартоўныя песні", "Песні пра каханне", "Сямейна-бытавыя песні", "Сацыяльна-бытавыя песні" (сумесна з В.Скіданам), "Прыпеўкі", забяспечыў іх навуковым календаром і аналітычнымі прадмовамі.

У 1969 г. абараніў кандыдаацкую дысертацыю, прысвечаную генезісу беларускіх прыпевак, а ў 1986 г. разам з калегамі-фальклярыстамі Г. Барташэвіч, Л. Салавей, Л. Малаш, К. Кабашнікавым, А. Гурскім і іншымі быў уганараваны Дзяржаўнай прэміяй БССР. Запісы беларускага фальклору, зробленыя І. Цішчанкам, увайшлі ў пятнаццаць тамоў акадэмічнага выдання народна-паэтычнай творчасці.

Пэўны час і досыць плённа працаваў І. Цішчанка над даследаваннем гісторыі беларускай фалькларыстыкі. У раздзеле сваёй кнігі "Да народных вытокаў", які носіць назву "На згаслай хвалі рамантызму" ён эцюдна паказаў працу фальклярысткі Лізаветы Паўлоўскай, што пазначыла свае "Беларускія народныя песні" крыптонімам Е. П., разгледзеў уклад у беларускую фалькларыстыку міфолага Паўла Шпілеўскага. А ў раздзеле "Падзвіжнікі" прааналізаваў фалькларыстычную дзейнасць Адама Кіркора і Івана Насовіча. У асобным раздзеле на шырокай дакументальнай аснове даследаваў дзейнасць Рускага геаграфічнага таварыства і яго філіяла Паўночна-Заходняга аддзела, стараннем якіх было шмат зроблена дзеля збірання матэрыялаў па матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

У выданні "Беларуская фалькларыстыка" (1989 г.) І. Цішчанакам асветлена збіральніцкая і навуковая праца яшчэ дзесяці народазнаўцаў, фальклярыстаў і этнографаў, а менавіта П. В. Шэйна, П. А. Бяссонава, П. А. Гільтэбрандта, Ю. Крачкоўскага, Е. Р. Раманава, Я. А. Ляцкага, М.В. Доўнар-Запольскага, А. Я. Багдановіча. А ў пасмяротным выданні фальклярыста "З творчай спакдчыны" – навуковыя нарысы пра І. А. Сербава і М. І. Кастамарава ды цікавы новымі звесткамі і фактамі разгорнуты артыкул пра беларускга фальклярыста і гісторыка рускай літаратуры праф. Яўгена Ляцкага.

Былі яшчэ літаратурныя партрэты славутай спявачкі народных песень, у тым ліку беларусіх, Ірмы Яўнзем і музыкі XIX ст. Міхала Гузікава. Нарыс-партэт пра Гузікава называўся "Беларускі Арфей".

Цікавасць да асобы творцы, асабліва да носьбітаў беларускай тардыцыйнай і прафесійнай культуры прывялі навукоўца да думкі паспрабаваць сябе ў іншых жанрах ды формах, па-за навуковымі артыкуламі і манаграфіямі.

Пасля напісання брашуры "Жыццё песні" з рэжысёрам Людам Гідравічусам І. Цішчанкам была створана дакументальная стужка "Бывайце здаровы" пра паэта – песенніка Адама Русака. У сааўтарстве з А. Лісам быў напісаны сцэнар і пастаўлены дакументальны фільм пра валадара беларускай песні, фальклярыста і слыннага дырыжора Рыгора Раманаваіча Шырму. А ў творчым супрацоўніцтве з рэжысёрам Рычардам Ясінскім створана паўнаметражнае дакументальнае кіно "Вяртанне Міхася Забэйды-Суміцкага".

Паспрабаваў Іван Кірылавіч пяро і ў мастацкай прозе, апублікаваўшы ў часопісе "Маладосць" апавяданне "Склізень", пазначанае сапраўдным псіхалагізмам і дасканалым валоданнем беларускім словам і складам. Большасць жа навелістычных сюжэтаў (быў дасканалым апавядальнікам) распазычыў знаёмым пісьменнікам. Асабліва калегам па лецішчы на Лысай гары.

У актыве І.К. Цішчанкі сааўтарства падручнікаў па беларусім фальклоры для ВНУ, некалькі выпускаў хрэстаматыі "Беларускі фальклор". Апошнія дзесяць год да заўчаснай смерці ў лютым 2001 г. Іван Кірылавіч ўжо ў прафесарскім зэанні чытаў курс фальклору і беларускай міфалогіі ў Беларускім 'дзяржаўным універсітэце культуры. Апошнія тры гады паводле апытання студэнтаў меў рэйтынг лепшага лектара гэтай навучальнай установы.

Арсень Ліс.

УСПАМІНЫ ПРА СТАРЭЙШАГА КАЛЕГУ

да 75-гадовага юбілею Івана Кірылавіча Цішчанкі

Іван Кірылавіч Цішчанка неаднойчы гаварыў, што надта любіць выкладчыцкую працу ва універсітэце культуры і ў аудыторыю да студэнтаў заўсёды ідзе з ахвотай. Ен шмат гадоў прысвяціў чыстай акадэмічнай навуцы, і ўжо ў сталым узросце ўрэшце прыйшоў да дзейнасці, якая выдатна сумяшчала яго навуковае, прафесійнае зацікаўленне народнай творчасцю і дазваляла раскрыцца яго асабістым якасцям, такім, як аратарскае майстэрства, артыстызм, дасціпнасць і эмацыйнасць.

Аблічча выяўляла неардынарнасць яго натуры: ясныя, з гарэзлівай іскрынкай вочы (погляд іх часам мог быць пранізлівы і строгі), смуглявы прыгожы твар, густыя, хвалістыя з сівізной валасы. З'яўляўся на занятках Іван Кірылавіч Цішчанка заўсёды ў гарнітуры і гальштуку, рухаўся жвава і па калідорах нібыта "лятаў". Узгадвае Ірына Грамовіч, дацэнт кафедры беларускай народна-песеннай творчасці: "Добразычлівы, шчыры твар Івана Кірылавіча запомніўся мне з таго моманту, калі ён зайшоў у аўдыторыю, дзе я працавала з хорам студэнтаў завочнага навучання. Гэта было прыкладна дзесяць гадоў таму. У той час я і ўявіць сабе не магла, што высокую адзнаку маім спевам і спевам студэнтаў дае вядомы вучоны-фальклярыст".

Ен быў выдатны апавядальнік. Умеў і любіў баяць розныя гісторыі з успамінаў маладосці, з фальклорных экспедыцыяў, наогул – з жыцця. Забаўныя дыялогі з гультаяватымі студэнтамі Іван Кірылавіч перадаваў класічна, тым самым навучаў і выхоўваў гэтых жа студэнтаў. У лекцыях, галоўнай сваёй працы, ён рэалізоўваўся як навуковец і творца. Міфалогія і фальклор беларусаў былі, без сумнення, любімай дысцыплінай не аднаго пакалення студэнтаў універсітэта культуры. (Некалькі гадоў запар па апытаннях менавіта Івана Кірылавіча называлі студэнты лепшым выкладчыкам года). Сапраўды, выкладаў прафесар Цішчанка грунтоўна і вельмі цікава. Аўдыторыя, зачараваная ім, магла сядзець пасля званка: абы толькі працягваўся незвычайны экскурс у сівую даўніну.

На перапынку прафесар Цішчанка нязменна купляў у кіёску некалькі газетаў, потым, седзячы на кафедры ў сваім любімым крэсле, чытаў іх з уважлівасцю, і бывала, каментаваў тое-сёе. У часы, калі Іван Кірылавіч працаваў на кафедры гісторыі і музеязнаўства (ды і цяпер так вядзецца), адносіны паміж калегамі былі прыязныя і добразычлівыя. Гаварылі заўсёды па-беларуску. Газетныя навіны часам абмяркоўвалі разам. Думку маладзейшых Іван Кірылавіч паважаў і вельмі цаніў трапнасць у мове (мог нават узрадавацца і потым ухвальна паўтарыць спадабалае яму слоўца ці выказванне). На кафедры пілі хто каву, хто гарбату, а Іван Кірылавіч сам любіў і іншых заахвочваў да запараных зёлак: чабару, мяты. Казаў, што гэты напой дае яму моц, што ніякая гарбата не смачнейшая за зёлкі, сабраныя тут, на Беларусі.

Аднойчы ён распавёў гісторыю свайго незвычайнага знаёмства з адной дзяўчынай. "Было мне за трыццаць, - узгадваў Іван Кірылавіч, - даўно ўжо надышоў час жаніцца... Тэма гэтая нават абмяркоўвалася маімі сябрамі. Як толькі яны не спрабавалі спрыяць мне ў выбары нявесты – але безвынікова. Дык вось, стаім мы аднойчы на прыпынку з маім самым блізкім сябрам, а той зноў давай пра жаніцьбу. Я і кажу яму нібы жартам, што падыдзе зараз тралейбус, зойдзем, там я і выберу сабе дзяўчыну. Так і адбылося! Зайшлі і позірк мой спыніўся на прыгожай маладой асобе. "Гэта яна!" – пранеслася ў думках. Вельмі яна мне спадабалася - вачэй не мог адвесці. Хочу нешта сказаць, а язык нібы прырос. Я і пайшоў за ёй моўчкі, толькі сэрца тахкала...". Так Іван Кірылавіч сустрэў сваю будучую жонку Марыю Ільінічну.

У 2000 годзе ва універсітэце адзначалі 70-гадовы юбілей прафесара Івана Кірылавіча Цішчанкі. Словы ўдзячнасці за працу, пажаданні здароўя і здзяйснення творчых планаў казалі супрацоўнікі універсітэта культуры, літаратары і навукоўцы. Сам юбіляр з букетамі ружаў у атачэнні сяброў і калегаў выглядаў сапраўды шчаслівым. Іван Кірылавіч умеў радавацца і прыносіць радасць іншым.

Яму, між іншым, вельмі спадабалася жартоўная паэма, напісаная, згодна законаў жанру, ананімным аўтарам. Яна гучала на сцэне ў выкананні студэнтаў факультэта.

Іван на Парнасе


Ці знаў хто Цішчанку Івана,
Што ў прафесарах хадзіў?
За кафедрай,
у БУКу знаным
Гадоў ён многа адрабіў.
Што ж,
чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губу ён не браў,
І быў у ласцы ў дэкана
(Яго той дужа шанаваў!).
Але ж і Іван у працу многа
Старання-поту ўкладаў:
Чуць золак -
ён партфель у рукі,
І памінай хто дома знаў.
(А ў тым партфелі
шчэ з вячора
Канспекты тоўстыя
ляжаць)
Імчыць Іван усім патокам
Сваю навуку выкладаць.
Пра міфы нашага народу
Чытаў ім Цішчанка Іван.
Ды раз бяда яго спаткала.
Во як казаў пра гэта сам:
. . .

Добрае пачуццё гумару, дасціпнасць спадарожнічалі Івану Кірылавічу заўсёды. Ен быў уважлівы да людзей, асабліва грэла яго сэрца родная Слаўгарадчына. Аднавяскоўцы, сваякі, узгадваючы яго прыезды на радзіму, у вёску Улукі, казалі, што Ванечка наведваў усіх, любіў пасядзець, пагаманіць, распытацца пра жыццё і здароўе. Шмат фатаграфаваў людзей (і сам на фотаздымках атрымліваўся ўсмешлівы, прыгожы). З задавальненнем слухаў песні і ўмеў вельмі добра спяваць. Іван Кірылавіч збіраў народныя вуснапаэтычныя творы яшчэ з маладосці. У 1951 годзе ад 90-гадовай бабулі запісаў замову, якая ўвайшла ў хрэстаматыю па фальклору. Але асаблівы гонар яго, як фальклярыста, складала змешчаная там жа "дынастычная" пчалярская замова (Цішчанкі бацька і дзед былі пчалярамі). "Як маці зямлі, свайго месца пільнуйцеся"... Хто ведае, можа гэтыя словы старажытнай дзядоўскай замовы для пчолаў адыгралі ролю ў выбары Іванам Кірылавічам свайго жыццёвага шляху.

Узгоркі, лясы на даляглядзе, невялічкая пакручастая рачулка Проня, што бяжыць між кустамі алешніку недалёка ад бацькоўскай хаты – усё гэта было, мусіць, самым дарагім для Івана Кірылавіча. Ен распавядаў пра сваё дзяцінства, пра тое, як у гады вайны маці і сястра выратавалі яму жыццё.

Лёс сястры-Вольгі Кірылаўны быў такі ж, як і лёс многіх беларускіх жанчынаў: вайна разбурыла яе каханне, яе чалавечае шчасце. З гэтым звязана песня, якую Іван Кірылавіч упершыню пачуў ад сястры, запомніў і на ўсё жыццё палюбіў. Аднойчы ў час гутаркі з Ірынай Грамовіч пра беларускія спеўныя традыцыі, Іван Кірылавіч вырашыў паказаць ёй, як гучыць гэты твор. "Песня "Адлятае мой саколік, адлятае" настолькі спадабалася мне і запала ў душу, - успамінае Ірына Грамовіч, - што я проста сказала: "Яна мая". Потым было творчае супрацоўніцтва з кампазітарам Эмілем Наско, і ў выніку ўзнікла апрацоўка і аркестроўка. Так песня атрымала сваё другое нараджэнне. І гэта адно з таго, што складае добрую памяць аб Івану Кірылавічу Цішчанку.

Анастасія Гулак,
кафедра этналогіі і фальклору БДУКіМ.



БЕЛАРУСКІ МАСТАК ПЯТРО ДРАЧОЎ

8 траўня на 68-м годзе жыцця памёр вядомы беларускі мастак, графік Пётр Мікалаевіч Драчоў. Пётр Мікалаевіч нарадзіўся 6 ліпеня 1937 г. у Ленінградзе, куды ў пошуках заробку з вёскі Бель Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці перасхалі яго бацькі. У 1941 г. ён з маці і сястрой паехаў на канікулы ў родную вёску, дзе іх застала вайна. У 1942 г. абараняючы Ленінград, загінуў бацька. У 1945 г. ад хваробы памерла маці. Пятра накіравалі ў Мсціслаўскі дзіцячы дом. З 1953 па 1958 г. ён вучыўся ў Менскай мастацкай навучальні, з 1958 па 1964 г. – у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Пасля заканчэння інстытута працаваў мастацкім рэдактарам у часопісе "Бярозка". З 1992 г. стаў мастацкім рэдактарам "Беларускага гістарычнага часопіса".

Пётр Мікалаевіч пакінуў значны след у кніжнай і станковай графіцы. Сярод яго твораў – серыя акварэляў "Помнікі архітэктуры Беларусі" (1970-1982), "Бярэзінскі запаведнік" (1975-1979), літаграфіі "Кірмаш канца XIX – пачатку XX ст." (1972), "Дзяды", паводле паэмы А. Міцкевіча (1973), "Паўстанне 1863 г." (1978), "Спынім забойствы..." да 500 годдзя Міколы Гусоўскага (1980), серыя "Асветнікі" (1989), зрабіў копію Жыровіцкага Евангелля (XV ст.). ілюстрацыі да кніг У. Дубоўкі, П. Броўкі. У. Караткевіча, І. Новікава. Дыярамы "На старажытным гарадзішчы", "Францыск Скарына трымае экзамен перад прафесарамі ў Падуанскім універсітэце" і інш.

Для Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Пётр Драчоў выканаў работы "Гандаль у Полацку", "Падводны свет нашых азёр", "Паселішча на Сенніцы", "Крэмнездабыўныя шахты ў Красным", "Францыск Скарына ў друкарні", стварыў панараму "Пажар г. Магілёва ў 1700-1721 гг".

Пётр Драчоў – аўтар мастацкага афармлення музея гісторыі медыцыны Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, мемарыяльнага музея У. Караткевіча ў Оршы і Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі.

Усе мы, каму давялося ведаць гэтага таленавітага мастака, шчырага і сумленнага чалавека, смуткуем разам з яго сям'ёй і выказваем спачуванні родным і блізкім Пятра Мікалаевіча Драчова.

Рэдакцыя "Беларускага гістарычнага часопіса",
Калектыў выдавецтва "Адукацыя і выхаванне",
Беларускі саюз мастакоў.

САЮЗ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ - ВЯРТАННЕ З ЗАБЫЦЦЯ



Такую назву мае кніга Ціны Клыкоўскай, якая выйшла ў выдавецтве "Беларускае гістарычнае таварыства" у Беластоку (2004 г.) і днямі трапіла ў мае рукі. Манаграфія прысвечана памяці Янкі Жамойціна і надрукавана пры грашовай дапамозе Гарадской Управы ў Беластоку і Уладзіміра Гарэліка. Да напісання кнігі спрычыніліся Алесь Мазур, Павал Карназыцкі, Юры Гумянюк, Ірына Халіп, Таццяна Снітко, Сяргей Пульша, Алесь Палынскі...

Манаграфія "ставіць за мэту абагульніць тыя нешматлікія звесткі пра нацыянальна-патрыятычны моладзевы рух у Беларусі падчас нямецкай акупацыі, якія знаходзяцца сёння ў межах дасягальнасці даследчыкаў. Мэта выдання-спроба доследу феномену нацыянальнага ўздыму беларускай моладзі, які прыйшоўся на складаны і супярэчлівы час, калі беларускае грамадства жыло пад нямецкім прыгнётам, пад партызанскім тэрорам, у чаканні прыгнёту савецкага, не губляючы надзею на тое, што перамога хаўруснікаў фашыстоўскага рэжыму вырашыць "беларускае пытанне на карысць тутэйшага люду"

"Менавіта ў гэты час беларуская моладзь здолела згуртавацца і стварыць масавую арганізацыю – Саюз Беларускай Моладзі. Яе сябрам быў накаваны трагічны лёс, "забыццё і ганьба".

Трэба адзначыць, што новая кніга Ціны Клыкоўскай – гэта грунтоўнае гістарычнае даследванне. Манаграфія будзе цікавай не толькі прафесійным гісторыкам, але сучаснай беларускай моладзі.

Аляксей Шалахоўскі,
старшыня суполкі ТБМ "Гісторыя".

ПАМЯЦІ ДОКТАРА БАРЫСА РАГУЛІ

Памёр Барыс Рагуля, доктар медыцыны, заступнік Старшыні Рады БНР, старшыня сусветнай арганізацыі "Канферэнцыя Вольных Беларусаў", дзеяч у Канадыйскім фондзе дапамогі ахвярам Чарнобыля ў Беларусі, былы старшыня Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады (ККБК), Выдавецкага Фонду беларускіх падручнікаў пры ККБК, Беларускага Інстытута Навукі і Мастацтва ў Канадзе, дзейны сябра Згуртавання Беларусаў Канады і ахвярны парафіянін БАПЦ Св. Кірылы Тураўскага ў Таронта.

Памёр др. Барыс Рагуля 21 красавіка, 2005 года ў Лондане, Антарыё, Канада. Было яму 85 год.

Першы раз сустрэла я светлай памяці Барыса Рагулю недзе ў канцы 1945 года ў беларускім лагеры Ватэнштэт, што ў ангельскай зоне Нямеччыны... было нейкае свята, ці не Новы год. За застольнай бяседай з'явіўся незнаёмы жывы, энергічны, малады, як і ўсе мы, чалавек, які заявіў нам: "Чаго вы тут сядзіце ў лагеры, чаму не ідзяце вучыцца?!"

– Мы хочам вучыцца, кажу яму, але немагчыма дастацца на універсітэт. Універсітэты прымаюць перш за ўсё сваіх нямецкіх былых жаўнераў, якія толькі што вярнуліся з вайны.

- На універсітэце ў Марбургу ёсць мейсцы для беларусаў! Ці хто з вас паехаў бы ў Марбург? – кажа незнаёмы.

Марбург у амерыканскай зоне. За граніцай... Аказваецца, інтэлігентны, спрытны, харызматычны студэнт медыцыны Барыс Рагуля выстараўся на універсітэце Марбургу мейсца не толькі для сябе і свае жонкі Людмілы, а і 30 мейсцаў для беларусаў.

Я паехала ў Марбург. І так, дзякуючы Барысу Рагулю, ягонай дбайлівасці пра беларускія справы, пра беларускіх студэнтаў, я змагла прадаўжаць за мяжой універсітэцкія студыі, ды пасля здабыць прафесію.

У нашай даволі вялікай. вясёлай студэнцкай арганізацыі, старшынём якое быў заўсёды Барыс Рагуля, былі сябры розных поглядаў і кірункаў. Былі БНР-аўцы – крывічы і БЦР-аўцы – зарубежнікі. Ды розніцы ў поглядах не перашкаджалі нам ані ў навуцы, ані ў складанні экзаменаў, ані ў багатым сяброўскім жыцці. Усе мы былі беларускімі патрыётамі. Усе мы ішлі пад бел-чырвона-белым штандарам і старадаўняя крывіцкая Пагоня біла ў сэрцы нашы, біла мячамі, не давала чужынцамі быць, і ўсіх нас яднала наша родная беларуская мова, бо "Міласцівы Бог" нас, як і Францішка Скарыну "з таго языка на свет пусціў". Жыве родная мова, жыве беларуская душа – беларуская нацыя.

Праз два, ці тры гады прыйшла "вэрунг" - рэформа грошай. З 10-цёх нямецкіх марак зрабілася толькі адна марка. Настаў цяжкі час для нас беларускіх студэнтаў. Ды "Міласцівы Бог" меў над намі апеку. Газета "Бацькаўшчына" паведамляе, што ёсць магчымасць дастаць стыпендыі з Ватыкану. Толькі трэба ехаць вучыцца на ўніверсітэт у Лювэн, у Бельгію. Ізноў наш Барыс Рагуля у паразумленні з Радай БНР, яе старшынём інж. Міколам Абрамчыкам у цэнты справы атрымання стыпендыяў марбурскім студэнтам, ды арганізацыі паездкі ў Лювэн. І так паехалі ў Лювэн амаль ўсе беларускія студэнты з Марбурга. Засталася ў Марбургу канчаць студыі толькі я, бо была на апошнім годзе дэдэнтыстыкі, рыхтавалася да выпускных экзаменаў, застаўся і Лявон Трусевіч, які быў на перадапошнім годзе таго ж факультэта.

Радыё Ліберты "Свабода". У справах атрымання магчымасці арганізацыі бэнэраўскай беларускай секцыі радыё "Вызваленнне" – "Свабода" ізноў прычасныя былі беларускія студэнты з Лювэну, а між імі Барыс Рагуля гуляе ці не адну з галоўных роляў...

У 1997 годзе перад 22-ой сесіяй Рады БНР др. Барыс Рагуля, як заступнік Старшыні Рады БНР едзе з Канады ў Вільню на з'езд Еўрапейскага сектару Рады БНР. Памагае яго арганізаваць і дае на ім справаздачу з дзейнасці Рады БНР у Эгзылі. На 22 сесіі Рады БНР ў тым жа 1997 годзе ў Нью-Ёрку др. Барыс Рагуля быў перавыбраны як заступнік Старшыні Рады БНР і быў ім да смерці.

І так, Дарагі Сябра, шлях Твой змагарны за дзяржаўную незалежнасць Беларусі на гэтым свеце закончыўся, але дух Твой жыве ў плёне Твае працы, Тваіх асягненнях. Жыве ён ў Тваіх дзецях, унуках і нашчадках, якім Ты пакінуў запавет: "Сцяг свой высока трымай"!

Бывай, дарагі Барыс! Вечная Табе Памяць!

Ад імя беларускага грамадзянства Канады і сябе асабіста выказваю шчырыя спачуваннні жонцы Памерлага спадарыні Людміле, дзецям – Рагнедзе, Вітаўту, Уладзіміру, Андрэю і іхнім сем'ям.

Др. Раіса Жук-Грышкевіч.

Беларуская мова-
ТБМ
наша будучыня

Ахвяраванні на ТБМ

1. Філічонак Ларыса – 1000 р.
2. Вярбоўская Ірына – 1000 р.
3. Цахановіч Зміцер – 6000 р.
4. Цахановіч Святлана – 6000 р.
5. Яначкін Ігар – 1000 р.
6. Лукашонак А.А. – 1000 р.

Усе - суполка "Спаемства" г. Менск.

7. Казлоўская Іна – 2300 р., г. Менск.
8. Надзея Барт-Юрэвіч–50 еўра, Германія.
9. Афанасева Алена – 20000 р., г. Менск.
10. Кастусь Верабей – 100 дол. ЗША.
11. Скрэчка Анатоль – 10000 р., г. Мазыр.
12. Кучарэнка В.І. – 1000 р., г. Менск.
13. Петруковіч В.І. – 19000 р., г. Менск.
14. Шкірманкоў Фелікс – 10000 р., г.Слаўгарад.
15. Руткоўская Я.К. – 10000 р., г. Менск.

Просім Вашыя ахвяраванні дасылаць на адрас: вул. Румянцава 13, г. Менск, 220005, альбо пералічыць на разліковы рахунак ТБМ № 3015212330014 у Менскай гардырэкцыі ААТ Белінвестбанка код 764 праз любое аддзяленне ашчадбанка Беларусбанк (камісійны збор пры гэтым не бярэцца).

Паведамленне

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705
атрымальнік плацяжу
Мінская гарадская дырэкцыя ААТ "Белінвестбанка"
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015212330014** Асабовы рахунак **764**

(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

Від плацяжу			Дата	Сума
Ахвяраванні	**на дзейнасць**			
ТБМ				

Пеня
Разам

Касір

Плацельшчык

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705
атрымальнік плацяжу
Мінская гарадская дырэкцыя ААТ "Белінвестбанка"
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015212330014** Асабовы рахунак **764**

(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

Від плацяжу			Дата	Сума
Ахвяраванні	**на дзейнасць**			
ТБМ				

Пеня
Разам

Квітанцыя

Касір **М.П.**

Плацельшчык

Перабежчыкі

Беларусы, як і ўкраінцы, жывуць на стыку дзвюх канфесій — каталіцкай і праваслаўнай, а гэта значыць, на стыку заходняй і ўсходняй еўрапейскіх цывілізацый. Таму часта беларусам даводзілася выбіраць адно або другое. Каб пазбавіцца гэтага выбару ў 1596 г. была падпісана Берасцейская царкоўная унія, якая паслужыла да 1840 г. своеасаблівым мастом паміж праваслаўнай і каталіцкай культурамі. І калі царкоўная унія некалькі згладзіла трэнні царкоўнага характару, дык засталіся супярэчнасці палітычныя і сацыяльныя. Яны існавалі ўвесь час, на працягу стагоддзяў. Не зніклі яны і цяпер.

Часта даводзілася ліцьвінам-беларусам выбіраць паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй або Расійскай імперыяй, паміж Рэччу Паспалітай і СССР. І маім дзядзькам па мацярынскай лініі давялося некалі рабіць гэты выбар. Жылі яны тады ў Заходняй Беларусі, якая была ў складзе Польшчы. Іван Варановіч (брат маёй маці) жыў у вёсцы Касічы, гміны Войстамскай, павету Вілейскага, ваяводства Віленскага, а Фадзей Роліч — у вёсцы Ролічы, гміны Вішнёўскай, павету Свянцянскага, ваяводства Віленскага. Фадзей ажаніўся з Маняй, якая даводзілася сястрой маёй маці Соні.

Каля 1930 г. Іван і Фадзей яшчэ былі дзецюкамі і рашылі кожны паасобку пашукаць шчасця за мяжой. Яны вырашылі знайсці яго на ўсходзе. Задумалі ўцячы з Польшчы ў Савецкую Беларусь, бо там няма паноў, і самі працуюць на сябе. Так думалі многія мужыкі, асабліва моладзь.

Камуністычная партыя Заходняй Беларусі і Беларуская сялянска-работніцкая грамада гэтыя настроі падтрымлівалі ў народзе і вялі актыўную агітацыю, тым самым і папаўнялі суполкі ў вёсках і мястэчках. Іван Варановіч стаў сябрам Таварыства беларускай школы і падтрымліваў Грамаду, якой кіраваў Браніслаў Тарашкевіч. Фадзей Роліч ні ў якія суполкі не ўваходзіў. І Варановіч і Роліч паспрабавалі каля мястэчка Радашковічы перайсці польска-савецкую мяжу, але былі затрыманы памежнікамі яшчэ на польскім баку.

Як жа далей склаўся іх лёс? Аб гэтым мне расказалі самі перабежчыкі ў 1973 ці 1974 годзе, пасля смерці маёй маці. Я на той час працаваў недалёка ад Радашковічаў. Выкладаў у школе гісторыю. І мне хацелася ведаць, як жылося маёй маці і маім дзядзькам пры Польшчы, у той краіне, дзе і я нарадзіўся ў 1937 годзе. Я папрасіў кожнага дзядзьку расказаць, як яны ацэньваюць праз 40 гадоў свае ўчынкі маладосці. Пытанне я ім задаў у дарозе. Мы ішлі з вёскі Нарочы на наш хутар Струменне, які тады быў каля вёскі Касічы. Цяпер яго ўжо няма, ды й вёска дажывае свой век.

Іван Варановіч расказаў пра свае прыгоды на граніцы так:

— Пераходзіў граніцу каля Радашковічаў я двойчы. Першы раз нават удачна. За грошы праваднік правёў мяне, і я трапіў да савецкіх пагранічнікаў. Тыя дапыталі мяне, і адправілі назад, дадому. Сказалі: "Каб ты пана забіў або спаліў яго сялібу, дык тады можа б мы прынялі". Не памагло і тое, што я, як дурань, прасіўся да сястры ў Сібір. Яна там засталася, як мы былі ў бежанстве ў 1915—1921 гадах.

Недзе праз год, — распавядаў Іван, — я направіўся зноў пад Радашковічы. Хацеў каля граніцы штонебудзь падпаліць, але не змог. Папрасіў праваднік, каб паказаў патаемную сцежку на савецкі бок. Але на гэты раз праваднік здаў мяне польскім пагранічнікам.

Пасадзілі мяне ў камеру, нават належным чынам не абшукаўшы. Да мяне ў камеру падсадзілі крымінальніка, злодзея. Я яму па вясковай прастаце і расказаў, што з дакументамі Грамады і ТБШ хацеў уцячы ў БССР. Назаўтра той злодзей на допыце следчаму заявіў: "Ну што я благога зрабіў? Падумаеш, у пана барана ўкраў. Што ён у пана адзін ці што? Не збяднее той пан без аднаго барана. У вас у камеры сапраўдны злачынца сядзіць, не абы-які, палітычны. Ён усё гаспадарства хоча ў вас украсці".

На наступным допыце маю ватоўку (ці світку) добра абмацалі і знайшлі тыя дакументы, пра якія я расказаў сукамерніку. Мяне адправілі ў пастарунак гміны ў Войстама, для разбору па месцы жыхарства.

У тым Войстамскім пастарунку я сядзеў нядоўга. Неяк увечары паліцэйскі, які мяне ахоўваў, пайшоў вячэраць і затрымаўся. А я тады часу не губляў, пакуль ён вячэраў, я разабраў комін печкі і ўцёк. Уцёк дамоў. А каб зноў не забралі, асядлаў пугу і на ёй прыехаў да пана Міхала Бахчанскага ў Равутку шукаць бацьку. І пан, і бацькі, і ўся вёска ўспрынялі тое, што бачылі. Здурнеў. І мяне пакінулі ў спакоі. Не чапалі. Нават на допыт не выклікалі.

Праз нейкі час, можа праз год, быў набор у Вілейцы на работу ў Францыю. Стаяла доўгая чарга, і я заняў чаргу. Паліцэйскія ўбачылі, што я стаў у чаргу на выезд, падышлі і запыталі:

— Варановіч, хочаш у Францыю паехаць?

— Хачу.

— Дапаможам, — сказалі мне.

Паліцэйскія павялі мяне ў офіс і ўсе дакументы на выезд у Францыю аформілі без чаргі. Яны мелі сваю рацыю — хай едзе хоць у Францыю, абы не бунтаваў тут, цішэй будзе. Я там на шафёра вывучыўся. Грошай зарабіў. Прыслаў франкаў бацьку на студню, а Соні (маёй маці — *С.Б.*) — на пасаг. Соня змагла зямлю ў пана купіць і жыць на сваім хутары. Шкада што ў калгас загналі. І поле, і сенажаць, і лясок ды рэчка побач. І усё разам. Вясёлае месца.

— А мне цяжэй было, — стаў расказваць Фадзей. — Злавілі на граніцы. Судзілі. Далі няшмат — паўгода. Увесь час у турме не быў. Капаў канаву каля Кобрына, пад аховай паліцэйскіх. А ведаеш, пляміш, я на палякаў не ў крыўдзе. Сёння я нават рады, што палякі злавілі мяне, бо тыя дзецюкі (каля 20 чалавек) з Іжа або іншых вёсак, што перайшлі польска-савецкую мяжу былі прыняты за шпіёнаў і аказаліся ў лагеры ў Сібіры. З нашай кумпаніі толькі аднаго сустрэў з Іжа. Удалося яму выжыць і вярнуцца на радзіму. Ён расказваў мне: "Усіх нашых дзецюкоў у тайгу адправілі лес валіць. Гародніны ніякай. Цынга і іншыя хваробы скасілі іх. Нам прапаноўвалі настой з хвоі піць. Я піў, а іншыя не маглі, не хацелі, распанелі пры Польшчы. Я выжыў, а яны ...".

Так што палякі хоць пасадзілі, але тым самым выратавалі жыццё. І ў Войску Польскім служыў, як і твой бацька. Абучалі ў войску палякі добра.

Бадай усе ці большасць з тых, хто паслужыў за польскім часам у войску з фронту (1944—1945 гады — *С.Б.*) вярнуліся. А тыя, хто ў Польскім Войску не быў, і забралі ў Савецкую Армію ў 1944 годзе, і аказаліся на фронце пасля вельмі кароткай падрыхтоўкі, загінулі. Не ўмелі ані акапацца, ані схавацца, ані наступаць. Нас, польскіх жаўнераў, можна было з вінтоўкамі супраць немцаў і ў рукапашную кінуць і ў рассыпную наступаць — не падвялі б, перамаглі б — што значыць добра абучаныя. Мяне раніла, але жывы застаўся.

— З Польшчы да Саветаў уцякалі, бо зямлі ў многіх мала было, а зарабіць грошай не было дзе, — сказаў дзядзька Іван. — Але сёння я рады, што той праваднік мяне здаў палякам. Напэўна, ведаў, што ў СССР мяне могуць расстраляць, а тут толькі пастрашаць. Таму праваднiку сёння трэба "Дзякуй" сказаць, што я жывы.

Пасля гэтых слоў я ўспомніў, як у 1953 ці 1954 годзе позняй воссеню маці прынесла за спіной клунак у хату, скінула яго і заплакала. Сказала мне: "Не лянуйся, вучыся, каб ты тут у калхозе не застаўся. Бачыш, што робіцца? Купілі зямлю пры Польшчы. Хай сабе і няшмат — усяго тры гактары, і тую адабралі. А цяпер працуем з бацькам за "палачкі". Вось колькі я зарабіла за ўвесь год. Далі клунак нейкіх азадкаў. Толькі курэй карміць, а не самім есці".

— А тату колькі далі? — запытаўся я.

— А бацька няпоўны мяшок атрымаў. А на работу хадзіў цэлы год, кожны дзень. Гавораць, пры панох кепска жылося. Але я ў пана столькі б зарабіла за адзін дзень — колькі ў калхозе за год. Служылі ў багатых і я, і бацька твой, нейкія грошы сабралі, а пасля брат Іван з Францыі падаслаў" — працягвала выказваць сваю крыўду маці і плакаць.

Я сядзеў за сталом рабіў свае ўрокі, тады вучыўся ў шостым класе, і мне было шкада маці, якая зычыла сыну пакінуць свой кут, абжытае роднае гняздо, каб вырвацца з калгаснага прыгону, дзе працуюць за "палачкі" — працадні, за якія амаль нічога не плацяць. І мне тады ўспомнілася прыпеўка, якую чуў ад вясковых паўп'яных кабет.

Сядзела баба на раллі
І лічыла працадні.
— Працадзень, працадзень,
Дай ты хлеба хоць на дзень.

На памяць наляцела і расейская частушка, якая ў нас прыжылася.

Я в колхоз ишла — юбка новая,
А из колхозу шла — ж... голая.
А в колхоз я шла обувшись,
А из колхозу — босиком...

Сёлета я расказаў свайму кіраўніку пра сваіх дзядзькоў-уцекачоў. Мой галоўны рэдактар хоць і нарадзіўся пасля вайны, але з Заходняй Беларусі. А як вядома, менталітэты заходніх і ўсходніх беларусаў вельмі адрозніваюцца. Узяць бы хоць такі просты прыклад. Ва ўсіх вёсках Заходняй Беларусі да гэтага часу кожны гаспадар насупраць сваёй сялібы падмятае вуліцу. На ўсход ад былой польскай мяжы такога няма. У вёсках каля Менска ў 1970-х гадах, калі я там настаўнічаў, гаспадыні высыпалі смецце на вуліцу, каб не гразлі калёсы і аўтамашыны. Калі пра гэта я сказаў сваім аднавяскоўцам, дык яны мне не хацелі верыць.

Мой кіраўнік таксама прывёў прыклад пераходу польска-савецкай мяжы мужчынамі з-пад мястэчка Мір. Яны пераходзілі дзвюма ўзброеннымі групамі. Узброіліся паляўнічымі стрэльбамі. Першая група нечакана абстраляла польскіх пагранічнікаў каля станцыі Негарэлае і аказалася на савецкім баку. Другую ўзброеную групу польскія пагранічнікі не прапусцілі. Акружылі, абяззброілі і ўзялі ў палон. Іх судзілі. Далі ад трох да пяці гадоў турмы. Адсядзелі. Вярнуліся дамоў жывыя, здаровыя. А тыя, хто быў у першай групе, зніклі адразу, назаўсёды. Дзе яны дзеліся — да гэтага часу ніхто не ведае.

А далей гутарка з маім кіраўніком прадоўжылася так.

— Вось я атрымаў адукацыю ў Расеі. Там жывуць мае сын і дачка. Блізкія для мяне людзі. А цяпер давайце ўявім, што тут усталявалася зноў сталінская сістэма. Куды б я ўцякаў? — запытаў я.

— Напэўна, Вы ўлічылі б досвед сваіх дзядзькоў.

— Улічыў бы.

Шкада, што на пачатку XXI стагоддзя беларусы не ўлічваюць досвед старога пакалення. Некаторыя бяздумна едуць у Маскву і Падмаскоўе, нават у Сібір на будаўніцтва. Асабліва складана ім даводзіцца ў Маскве, дзе працуюць падпольна. Зароблены грошы яны атрымоўваюць несвоечасова. Не могуць выехаць дамоў. А калі грошы атрымаюць, дык праблема іх прывезці дамоў. На Беларускім вакзале ў Маскве да іх можа прычапіцца міліцыя. Няма білета — дадуць штраф. У цягніку могуць падсесці злодзеі ці забойцы. І тады будзеш радавацца, што хоць жывога пакінулі, а не скінулі пад адхон. Значна меней беларусаў ездзіць на заробкі ў Польшчу. Але едуць і на захад на будоўлю або на сезонныя сельскагаспадарчыя работы. Каго я не сустракаў пасля вяртання з Польшчы — не крыўдавалі, своечасова гаспадары заплацілі за работу. Спакойна выехалі. Паліцыя іх не пакрыўдзіла. Такога палявання, як у Маскве, на ад'язджаючых работнікаў у Варшаве няма.

Так што. калі ў беларускага чытача стане праблема выбару: куды паехаць на заработкі або ўцячы, дык добра падумайце да якога суседа прыхінуцца. Да таго. што жыве паводле законаў. або да таго. дзе закон. як дышла: куды павярнуў — туды і выйшла.

Сымон Барыс.

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віленскага краю

12.00 28 траўня 2005 г. субота

Фальв. Сьвіраны Віленскі р-н

Літаратурна-краязнаўчая імпрэза на тэму:

Святы куточак той Сьвіраны, дзе пуп паэта закапаны

У праграме:

1. Крыжовы шлях і асвячэнне фігуры Ісуса Хрыста.
2. Прэзентацыя кнігі Ўладзіміра Содаля пра Сьвіраны.
3. Выстава мастацкіх твораў Л. Мінкінай і Т. Маркавец.
4. Супольны абед.

Сьвіраны запрашаюць. Тэл. 2-41-99-92.

Юры Гіль.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220034, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231282, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: naszaslowa@tut.by
http://tbm.org.by/ns/

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 16. 05. 2005 г. у 11.30. Замова № 862.
Аб'ём 1 друкаваны аркуш. Наклад 2000 асобнікаў.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 1180 руб., 3 мес.- 3540руб.
Кошт у розніцу: па дамоўленасці.